

**Яцэвіч Мікалай Аляксандравіч**
Кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай
дзейнасці Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтваў

УДК 378.22:02]:378.4[008+7](476-25)

*М. А. Яцэвіч*

# Станаўленне сістэмы магістарскай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў

*Разгледжаны ўвядзенне і развіццё сістэмы магістарскай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Асаблівая ўвага нададзена змястоўным і арганізацыйным аспектам на кожным з этапаў. Ахарактарызаваны нарматыўна-прававая база функцыянавання магістратуры, адукацыйныя стандарты і вучэбныя планы. Прааналізаваны сучасная вучэбна-праграмная дакументацыя, тыпавы вучэбны план 2019 г., а таксама педагагічныя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе. Вызначаны актуальныя праблемы і перспектывы развіцця.*

Магістарская падрыхтоўка ўведзена з 1990-х гг. У гэты перыяд у Рэспубліцы Беларусь адбываўся актыўны пошук новых адукацыйных праграм, быў прааналізаваны сусветны досвед стварэння сістэмы «Бакалаўрыят – магістратура».

Можна вылучыць тры асноўныя этапы яе фарміравання:

I. Этап станаўлення – 1994–2008 гг.

II. Этап развіцця – 2008–2018 гг.

III. Сучасны стан.

Загад Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 225 ад 4 жніўня 1994 г. «Аб зацвярджэнні Палажэння аб шматузроўневай сістэме вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» [1] быў арыентаваны на вырашэнне наступных задач: забяспечыць варыятыўнасць навучання і бесперапыннасць адукацыі; ажыццявіць гуманітарызацыю навучання; павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў; нарасціць інтэлектуальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патэнцыял рэспублікі і падтрымліваць яго на належным узроўні; забяспечыць умовы для інтэгравання адукацыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь у міжнародную прастору.

Была вызначана структура шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі.

Першы ўзровень – падрыхтоўка спецыяліста з вышэйшай адукацыяй (тэрмін навучання 4–5 гадоў). З'явілася магчымасць засвоіць адукацыйную праграму па спецыяльнасці і паралельна (па жаданні) атрымаць акадэмічную ступень бакалаўра.

Другі ўзровень – спецыялізаваная (паглыбленая) падрыхтоўка ў канкрэтным напрамку прафесійнай дзейнасці спецыяліста, які мае вышэйшую адукацыю (тэрмін навучання 1–2 гады). Адначасова студэнт мог дадаткова атрымаць акадэмічную ступень магістра. Падрыхтоўка на другім узроўні ажыццяўлялася па індывідуальных вучэбных планах у вышэйшых навучальных установах універсітэцкага тыпу.

Як бачна, структура шматузроўневай вышэйшай адукацыі была дастаткова грувасткай, адрознівалася ад сусветнай практыкі падрыхтоўкі бакалаўраў і магістраў, аднак яе тэзісы пакладзены ў аснову новых дакументаў. Палажэнне стала першым крокам да разумення Балонскага працэсу, дэкларацыя якога падпісана ў 1999 г. Усё гэта ў поўнай меры датычыцца і магістарскай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў.

У 1993 г. Мінскі інстытут культуры атрымаў статус Беларускага ўніверсітэта культуры, была ўтворана аспірантура, стаў дзейнічаць савет па абароне дысертацый. На факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага ўніверсітэта культуры з 1994/95 навучальнага года пачалася бакалаўрская адукацыйная праграма па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія». Спецыфіка заключалася ў тым, што найлепшыя студэнты па выніках атэстацыі за тры гады навучання атрымалі магчымасць паралельна з асноўнай праграмай на IV–V курсах засвоіць дысцыпліны бакалаўрскай падрыхтоўкі. Праграма ўключала дадатковае вывучэнне агульнанавуковых і спецыяльных прадметаў у колькасці 300 гадзін, завяршалася абаронай бакалаўрскай дыпломнай работы або здачай дзяржаўнага экзамену па прафілюючай дысцыпліне на «добра» або «выдатна», атрыманне сярэдняга бала па выніках навучання не менш за «4» (пры пяцібальнай ацэнцы ведаў) [6].

Па заканчэнні студэнт атрымліваў акадэмічную ступень бакалаўра гуманітарных навук. Мэта бакалаўрыята – падрыхтоўка спецыялістаў для работы ў бібліятэках і інфармацыйных службах, якія пасля могуць прэтэндаваць на ступень магістра.

З 1997 г. на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага ўніверсітэта культуры пачалася магістарская падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і кнігазнаўства». Упершыню распрацаваны вучэбны план, а таксама правілы прыёму ў магістратуру. Права навучання мелі асобы, якія атрымалі акадэмічную ступень бакалаўра, а таксама тыя, хто на «добра» і «выдатна» скончылі вышэйшую навучальную ўстанову пры ўмове здачы дадатковых экзаменаў па праграме падрыхтоўкі бакалаўра. Пры роўных магчымасцях перавага аддавалася ўладальнікам дыплома бакалаўра гуманітарных навук.

На дзённай форме магістарская падрыхтоўка прадугледжвала паглыбленае засваенне асобных агульнанавуковых і спецыяльных дысцыплін і напісанне навуковай работы на працягу аднаго года. Завяршэнне навучання дазваляла студэнту атрымаць акадэмічную ступень магістра педагагічных навук і разглядалася як падрыхтоўка да навукова-даследчай і навукова-педагагічнай дзейнасці ў галіне бібліятэчнай справы і адукацыі. Выпускнікі магістратуры пачалі працаваць у бібліятэках, некаторыя скончылі аспірантуру, абаранілі дысертацыю і сталі выкладчыкамі на факультэце. Адзначым, што як тады, так і цяпер вострa стаіць праблема падрыхтоўкі навуковых кадраў.

З 2008 г. у адпаведнасці з артыкуламі 6 і 30 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб вышэйшай адукацыі» [7] і пункта 11 Палажэння аб другой ступені вышэйшай адукацыі, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 студзеня 2008 г. № 68 [8], магістратура непасрэдна звязана з аспірантурай. Яе спецыяльнасці суадносяцца з пералікам спецыяльнасцей Вышэйшай атэстацыйнай камісіі для падрыхтоўкі навуковых работнікаў.

У тыпавым вучэбным плане магістратуры па спецыяльнасці 1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства з'явіўся цыкл кандыдацкіх экзаменаў і заліку (філасофія і метадалогія навукі, замежная мова, асновы інфармацыйных тэхналогій). Нездача кандыдацкіх экзаменаў лічылася невыкананнем вучэбнага плана. Па заканчэнні магістратуры па названай спецыяльнасці прысвойвалася ступень магістра педагагічных навук. Тэрміны навучання – 1 і 1,5 года (адпаведна дзённае і завочнае), захаваліся і па сённе. Зазначым, што яны не адпавядаюць Балонскаму працэсу.

Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (2011), магістратура вызначалася як «паглыбленая падрыхтоўка спецыяліста, фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы з прысваеннем ступені магістра» [5]. Вышэйшая адукацыя II ступені давала права на працяг навучання, а таксама на працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі) і прысвоенай кваліфікацыі.

Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, да 2018 г. у краіне ажыццяўляліся дзве праграмы магістарскай падрыхтоўкі: 1) фарміруе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай працы (навукова-арыентаваная магістратура); 2) з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста (практыка-арыентаваная магістратура). На факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (далей – ФІДК) рэалізоўвалася адукацыйная праграма навукова-арыентаванай магістратуры, хаця частка дысцыплін вучэбнага плана не ў поўнай меры ёй адпавядала.

Новым этапам у развіцці магістарскай падрыхтоўкі стала распрацоўка дзяржаўнага адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, які зацверджаны і ўведзены ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 жніўня 2012 г. [3]. Упершыню нарматыўна ўстаноўлены патрабаванні да прафесійнай дзейнасці магістра; пералік кампетэнцый, якімі ён павінен валодаць; змест вучэбна-праграмнай дакументацыі; узроўні асноўнай адукацыі асоб, што паступаюць у магістратуру; формы і тэрміны атрымання адукацыі; арганізацыя адукацыйнага працэсу і да т. п. Распрацоўшчыкамі сталі Ю. П. Бондар, С. В. Зыгмантовіч, В. А. Касап, Р. А. Ровіна, С. Л. Шпарло, М. А. Яцэвіч (кіраўнік групы), а таксама спецыяльныя кафедры ФІДК.

Аб'екты прафесійнай дзейнасці магістра ў стандарце ўстаноўлены дастаткова шырока: вытворча-тэхналагічныя працэсы ў бібліятэках, кніжных палатах і інфармацыйных цэнтрах; змест, формы і метады навуковых даследаванняў у вышэйзгаданых установах (формы, метады і сродкі кіравання ў іх); вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі бібліятэчных кадраў.

Згодна з аб'ектамі прафесійнай дзейнасці складзены патрабаванні да прафесійных кампетэнцый магістра ў галіне вытворча-тэхналагічнай, навукова-даследчай, навукова-педагагічнай, арганізацыйна-кіраўнічай і інавацыйнай дзейнасці. Названыя галіны адпавядалі дзеючаму на той момант адукацыйнаму стандарту I ступені па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (2008) [2]. Пастаўленая мэта размежавання зместу адукацыі на I і II ступені была дасягнута.

У адпаведнасці са стандартам тыпавы вучэбны план магістарскай падрыхтоўкі ўключаў 2268 гадзін вучэбнай работы (з іх – 518 гадзін аўдыторнай) і прадугледжваў наступныя віды дзейнасці: тэарэтычнае навучанне (наведванне лекцый і семінараў); навукова-даследчая работа (напісанне магістарскай дысертацыі); сесіі; педагагічная практыка; выніковая атэстацыя. Падчас сесій магістранты здавалі экзамены і залікі па такіх дысцыплінах, як «Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы», «Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», «Сацыялагічныя даследаванні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў бібліятэках», «Бібліятэчная педагогіка», «Праектная дзейнасць бібліятэк» і інш., а таксама вышэйназваныя кандыдацкія іспыты і залік.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 110 ад 2 лютага 2012 г. [9] зацверджаны «Правілы прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені», якія сталі больш лаяльнымі ў параўнанні з папярэднімі. Так, у іх адсутнічала патрабаванне абавязковага апублікавання навуковых прац (яны мелі значэнне пры аднолькавай колькасці балаў па выніках уступнага экзамену па спецыяльнасці), не ўстаноўлены сярэдні бал па дысцыплінах I ступені навучання. Такія «паслабленні», відавочна, звязаны з тым, што конкурс у магістратуру значна знізіўся. Тэндэнцыя ўласцівая практычна ўсім ВНУ культуры на постсавецкай прасторы [11].

Асобы, якія не прайшлі на бюджэтную форму, атрымаўшы на экзаменах адзнакі не ніжэй за «шэсць», маглі паступаць платна. Аднак Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі рэгламентаваў строгія ўмовы: бюджэтнікі ў выпадку паступлення на платную форму ў магістратуру павінны кампенсаваць кошт навучання на I ступені, што абумоўлена абавязковым дзяржаўным размеркаваннем выпускнікоў з неабходнасцю адпрацаваць па спецыяльнасці не менш за два гады. Такім чынам была зменшана колькасць людзей, якія ішлі ў магістратуру з неадпаведнымі мэтамі [13].

Упершыню ўстаноўлена, што асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю I ступені па іншых спецыяльнасцях, удзельнічаюць у конкурсе, акрамя ўступных іспытаў па спецыяльнасці магістратуры 1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, з улікам вынікаў здачы дадатковага экзамену па прадмеце «Асновы псіхалогіі і педагогікі». Пасля сканчэння магістратуры студэнт, згодна са стандартам, мог атрымаць ступень магістра па галінах навук: педагагічных, гістарычных, філалагічных, тэхнічных. Аднак на ФІДК такога не адбылося – усім выпускнікам прысвойвалася толькі ступень магістра педагагічных навук, паколькі не было выпадкаў паступлення асоб з небібліятэчнай адукацыяй.

Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 35 ад 30 красавіка 2015 г. уведзены адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі трэцяга пакалення I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) [4]. ФІДК абгрунтаваў адкрыццё магістратуры па гэтай спецыяльнасці, якая ўвайшла ў «Пералік спецыяльнасцей і ступеняў вышэйшай адукацыі II ступені», зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 3 снежня 2018 г. Прадстаўлены наступныя напрамкі: Е Камунікацыі. Права. Эканоміка; Кіраванне. Эканоміка і арганізацыя вытворчасці; 23 Камунікацыі; 23 80 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі, выкладанне; 1-23 80 01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць [10].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У 2018 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацаваны макеты адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі I і II ступеняў пакалення 3+. На ФІДК распачата работа над стандартамі, аднак пазней прыпынена, што тлумачыцца адсутнасцю новай нарматыўна-прававой базы. Як вядома, работа над рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі Рэспублікі Беларусь працягваецца ўжо больш за тры гады, але ён да гэтага часу не прыняты. Нягледзячы на такую сітуацыю, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь было прынята рашэнне пра неабходнасць распрацоўкі новых тыпавых вучэбных планаў магістарскай падрыхтоўкі.

Тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці 1-23 80 01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць II ступені зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 21 сакавіка 2019 г. У параўнанні з папярэднімі ён цалкам арыентаваны на навукова-даследчую, навукова-педагагічную і інавацыйную дзейнасць. У тыпавым вучэбным плане вызначана прафілізацыя – тэорыя і методыка навукова-даследчай і аналітычнай дзейнасці.

Тэрмін навучання – 1 год па дзённай і 1,5 года па завочнай адукацыйнай праграме. Колькасць акадэмічных гадзін – 1512, з іх 602 аўдыторныя (24 гадзіны вучэбных заняткаў у тыдзень). Прадугледжана правядзенне лекцый, семінарскіх, лабараторных заняткаў, практыкі, а таксама самастойная работа. Форма выніковай атэстацыі – абарона магістарскай дысертацыі. Каб атрымаць дыплом магістра, неабходна набраць 45 заліковых адзінак.

Тыпавы вучэбны план утрымлівае сем блокаў, у кожным з іх ёсць адпаведныя модулі: I. Дзяржаўны кампанент (модулі: «Метадалогія і методыка навуковых даследаванняў», «Навукова-даследчая работа»); II. Кампанент установы вышэйшай адукацыі («Інфармацыйна-аналітычная дзейнасць у навуцы і адукацыі», «Навукова-педагагічная дзейнасць»); III. Дадатковыя віды адукацыі (дысцыпліны кандыдацкіх экзаменаў і заліку); IV. Практыка (навукова-даследчая); V. Магістарская дысертацыя; VI. Выніковая атэстацыя (абарона магістарскай дысертацыі); VII. Матрыца кампетэнцый (блок з'явіўся ўпершыню), якімі павінен валодаць выпускнік магістратуры, складаецца з трох груп: універсальныя, універсальныя прафесійныя, спецыяльныя. Для кожнай указваюцца коды вучэбных дысцыплін, што іх забяспечваюць.

У параўнанні з папярэднім вучэбным планам магістарскай падрыхтоўкі дысцыпліны кандыдацкіх экзаменаў перасталі быць абавязковымі. Іх выбіраюць навучэнцы, якія ў далейшым ставяць перад сабой мэту паступлення ў аспірантуру.

Спецыяльныя кафедры ФІДК рыхтуюць магістраў па наступных вучэбных дысцыплінах: «Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», «Методыка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі навуковых прац», «Педагагічныя даследаванні», «Навукова-метрычныя даследаванні», «Інфармацыйная бяспека бібліятэчна-інфармацыйных сістэм», «Інфармацыйна-аналітычная дзейнасць вучонага і педагога», «Методыка выкладання бібліятэчна-інфармацыйных дысцыплін», «Кіраванне адукацыйнымі праектамі», «Бібліятэчная прафесіялогія», «Сацыяльнае партнёрства». Падрыхтавана неабходная вучэбна-праграмная дакументацыя, што складаецца з вучэбнага плана, зацверджанага рэктарам універсітэта, вучэбных праграм і вучэбна-метадычных комплексаў, а таксама індывідуальных планаў работы магістрантаў.

Выкарыстоўваюцца наступныя формы: праблемныя лекцыі, кейс-стадзі[1], трэнінгі, праекты, аналітычныя тэхналогіі і інш. У мэтах узмацнення практычнай падрыхтоўкі прадугледжана правядзенне вучэбных заняткаў на базе Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і інш.

Для дыягностыкі кампетэнцый прымяняюцца даклады-прэзентацыі на семінарскіх занятках і канферэнцыях; вусныя залікі і экзамены; пісьмовыя кантрольныя апытанні, эсэ; распрацоўкі канцэпцый, ацэньванне на аснове праектнага метаду і інш.

Ацэньваючы сучасны стан магістарскай падрыхтоўкі па спецыяльнасці 1-23 80 01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, неабходна канстатаваць, што яна адпавядае нарматыўна-прававым актам Рэспублікі Беларусь, рэгулюецца ўнутранымі нарматыўна-распарадчымі дакументамі; адукацыйны працэс у цэлым забяспечаны неабходнай вучэбна-метадычнай дакументацыяй, якая адлюстроўвае сучасны стан навукі і практыкі ў галіне бібліятэчнай справы. Патрабуецца працягнуць працу па ўдасканаленні вучэбна-метадычных комплексаў і выданні вучэбна-метадычных дапаможнікаў, у тым ліку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Існуюць і праблемы. Галоўная з іх – нізкая матывацыя ў студэнтаў-выпускнікоў I ступені адукацыі да працягу навучання на II ступені, што праяўляецца ў адсутнасці конкурсу пры паступленні ў магістратуру пры нязначных кантрольных лічбах набору: 3 чалавекі на дзённую форму навучання і 3 – на завочную. Пытанне сістэмнае і, безумоўна, патрабуе больш глыбокага даследавання. Адной з асноўных прычын такога стану падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў на II ступені з’яўляецца недахоп нарматыўна-прававых дакументаў, што вызначалі б сацыяльны статус магістра, пералік прыярытэтных пасад, якія ён мог бы займаць у бібліятэках.

[1] Кейс-стадзі (англ. Case study) – сістэма навучання, якая базіруецца на аналізе, вырашэнні і абмеркаванні змадэляваных або рэальных праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Факультэт у 2012 г. выходзіў з прапановамі аб унясенні змен у дзяржаўны даведнік «Пасады і кваліфікацыі ў сферы культуры і мастацтваў». Асноўная з іх – выпускнік магістратуры можа займаць пасаду бібліятэкара (бібліёграфа) I катэгорыі (праміну́ўшы II катэгорыю) без прад'яўлення патрабаванняў да працоўнага стажу. Можна значна скараціць для магістраў стаж, неабходны пры прасоўванні на больш высокія пазіцыі [11].

На нашу думку, прыняцце падобных мер на дзяржаўным узроўні дазволіць падняць прэстыж магістарскай падрыхтоўкі, прывядзе да павышэння конкурсу пры паступленні, дасць магчымасць адабраць найлепшых прэтэндэнтаў, а ў канчатковым выніку – выпусціць яшчэ больш кваліфікаваных спецыялістаў для навукова-даследчай, навукова-педагагічнай і інавацыйнай дзейнасці.

*1.* Аб зацвярджэнні Палажэння аб шматузроўневай сістэме вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь [Электронны рэсурс] : зацв. загадам Міністра адукацыі Рэсп. Беларусь 4 жн. 1994 г. № 225 // Право. Законодательство Респ. Беларусь. – Рэжым доступу: http://pravo.kulichki.com/zak/year1994/doc42140.htm. – Дата доступу: 13.07.2020.

*2.* Адукацыйны стандарт. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф : ОСРБ 1-23 01 11-2008. – Мінск : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2008. – 38 с.

*3.* Вышэйшая адукацыя. Другая ступень. Спецыяльнасць 1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. Ступень магістр (па галінах навук): педагагічных, гістарычных, філалагічных, тэхнічных : ОСВО 1-23 80 01-2012. – Уведз. 24.08.2012. – Мінск : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2012. – 18 с.

*4.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках). Кваліфікацыя залежыць ад напрамку спецыяльнасці : ОСВО 1-23 01 11-2014. – Уведз. 30.04.2015. – Мінск : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2015. – 37 с.

*5.* Кодекс Республики Беларусь об образовании : 13 янв. 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 дек. 2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 13. – 2/1795.

*6. Лявончыкаў, В.* Факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага ўніверсітэта культуры – 55 гадоў / В. Лявончыкаў, Р. Ровіна, Р. Матульскі // Бібліятэчны свет. – 2000. – № 2. – С. 5–7.

*7.* О высшем образовании : Закон Респ. Беларусь, 11 июля 2007 г., № 252-З : принят Палатой представителей 14 июня 2007 г. : одобр. Советом Респ. 22 июня 2007 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2007. – № 171. – 2/1349.

*8.* О некоторых вопросах высшего образования [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 18 янв. 2008 г., № 68 // Бизнес-инфо. – Режим доступа: http://bii.by/tx.dll?d=114484&a=19. – Дата доступа: 13.07.2020.

*9.* Об утверждении Правил приема лиц для получения высшего образования II ступени и признании утратившими силу некоторых постановлений Совета Министров Респ. Беларусь и их отдельных структурных элементов : в ред. постановлений Совета Министров Респ. Беларусь от 22 авг. 2013 № 736, от 17 нояб. 2017 № 861 [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 2 февр. 2012 г., № 110 // Белорусский государственный университет. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/page/43203.pdf. – Дата доступа: 12.07.2020.

*10.* Перечень специальностей и степеней высшего образования II ступени (магистратура) [Электронный ресурс] : утв. Министром образования Респ. Беларусь 3 дек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2018 г. // Белорусский государственный университет. – Режим доступа: http://nihe.bsu.by/images/cnpo/Perechen_3_12.pdf. – Дата доступа: 12.07.2020.

*11. Яцевич, Н. А.* Библиотечное образование: пути трансформации / Н. А. Яцевич // Научные и технические библиотеки России. – 2014. – № 1. – С. 42–45.

*12. Яцевич, Н. А.* О магистратуре замолвите слово: новые образовательные стандарты / Н. А. Яцевич // Библиотечное дело. – 2013. – № 3. – С. 39–41. – (Зарубежный опыт).

*13. Яцевич, Н. А.* Особенности подготовки библиотечных специалистов на второй ступени высшего образования – магистратуре [Электронный ресурс] / Н. А. Яцевич // Библиотеки и общество: история, реальность, перспективы взаимодействия : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 1–2 нояб. 2012 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Якуба Коласа. – Минск : Ковчег, 2012. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

*M. Yatsevich*

**Formation of master degree training system for library specialists**

*The introduction and development of the system of master degree training for library specialists at the Belarusian State University of Culture and Arts are considered. Particular attention is paid to the content and organizational aspects at each stage. The regulatory framework for the functioning of the master course, educational standards and curricula are described. Modern curriculum documentation, a typical curriculum for 2019, as well as pedagogical technologies used in the educational process, are analyzed. Current issues and prospects for development are identified.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 14.04.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ